*Прачытаў — перадай суседу!*

# Вольная СЕРАБРАНКА

МЯСЦОВАЯ ГАЗЕТА НЕЗАЛЕЖНАГА ГРАМАДСТВА

**№ 8 (12) снежань 2008**




МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

**ВІНШУЕМ з Раством, Калядамі і Новым годам!**

## Уладзімір Арлоў (пісьменнік і гісторык, былы жыхар Серабранкі):



– Віншую чытачоў “ВС” зычэннямі сваёй незабыўнай бабулі Аўгінні: “Дай Божа, каб былі здаровыя, як ільды калядовыя… Збаў, Божа, ад пустога коласу, ад рэдкага воласу, ад харчу незвычнага, ад голасу зычнага, ад цыганскіх вачэй, ад паганскіх рачэй… Людзям добрым – шчасце з рога, а чарту лукаваму – дальняя дарога”.

## Алег Трусаў (старшыня ТБМ, жыве на Пляханава):



– Віншую з Калядамі і Новым годам! Жадаю усім моцнага здароўя, поспехаў, плёну ва ўсім. Дарагія серабранцы, не забывайцеся на родную мову, часцей карыстайцеся ёю ў сям’і, на працы, у транспарце, а таксама на міні-рынку “Сера-бранка”.

## Аляксандр Ярашук (старшыня Кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў, працуе на Якубава):



– Ад імя БКДП, які налічвае ў сваіх шэрагах больш за 8 тысяч сяброў, сардэчна віншую ўсіх жыхароў Серабранкі з надыходзячымі святамі Раством і Новым годам. Нас з вамі яднае не толькі геаграфія (наш офіс месціцца ў Серабранцы – гэтым цудоўным кутку Мінска), але і жаданне мець прыстойны ўзровень жыцця, бачыць нашу краіну вольнай і квітнеючай, народ – шчаслівым і заможным. Жадаю, каб насуперак усім праблемам, які нясе эканамічны крызіс, 2009 год стаў для кожнага адметным у самым лепшым сэнсе гэтага слова.

## Палітык Аляксандр Дабравольскі



– Шчыра віншую чытачоў “ВС” са светлым святам Нараджэння Хрыстова і Новым годам! Жадаю сябрам, суседзям і суайчыннікам моцнага здароўя, добрага настрою і аптымізму, а таксама надзейнага сяброўства і ўдачы.

Свае віншаванні і цёплыя словы чытачам газеты перадаюць таксама галоўны рэдактар “Нашай Нівы” **Андрэй Скурко** (жыве на Ракасоўскага), адзін з кіраўнікоў БСДП (Г), гісторык і публіцыст **Анатоль Сідарэвіч** (офіс партыі месціцца каля прыпынку “Шэпічы”), кандыдат на парламенцкіх выбарах па Свіслацкай акрузе № 94 **Уладзімір Навасяд**. Няхай у вас, шаноўныя сябры, ў наступным годзе ўсё будзе добра, трымайцеся ;).

ЭКАНОМІКА

# Быць ці не быць?

**16 снежня прадпрымальнікі “Свелты” зладзілі стыхійны мітынг.**

На наступны дзень пасля маршу пратэсту на серабранаўскім рынку “Свелта” адбыўся невялічкі стыхійны мітынг працоўных. Сабраліся ўсе, хто мог кінуць на калегаў тавар – каля паўсотні дробных гандляроў, пераважна жанок. Рэй ізноў жа вёў старшыня прадпрымальніцкага аб’яднання “Перспектыва” Анатоль Шумчанка. Некалькі слоў сказаў лідэр ІПэшнікаў “Свелты” Сяргей.

Большасць працаўнікоў “Свелты” падтрымалі акцыю 15 снежня і патрабавалі ад сваіх лідэраў адказу на пытанне: “Што рабіць далей?” Спадзяванні дробных бізнесоўцаў, што іхні пратэст, выказаны двухтысячным маршам прадпрымальнікаў без падтрымкі грамадства, будзе пачуты ўладамі, не спраўдзіліся. Не спраўдзілася таксама інфармацыя напярэдадні рэспубліканскага страйку і шэсця аб тым, што ўлады разглядаюць прапанову Мінэканомікі аб захаванні для дробных прадпрымальнікаў ранейшых умоў працы.




Шумчанку давялося рэагаваць на крытыку за, па некаторых ацэнках, не вельмі ўдалую арганізацыю акцыі пратэсту (галоўным чынам, за яе нешматлюднасць). Прадпрымальнікі эмацыйна абмяркоўвалі сваё становішча. Галоўнае было ўсім зразумела: з 1 студзеня наступнага года ўлады наважылі загнаць “дробнікаў” у такія ўмовы, што, працуючы “чэсна”, апошнія самі дойдуць да згалення і знікнуць як клас альбо пачнуць працаваць па “шэрых” схемах, што аўтаматычна перавядзе іх у разрад крымінальнікаў і дасць сур’ёзныя падставы знішчаць “іпэшнікаў” ужо “па панятках”.

*Прадпрымальнікі “Свелты”, большасць якіх пайшла на акцыю 15 снежня, ушчувалі калегу: “Чаму не ўдзельнічала ў маршы?” На што тая адказвала: ”Вой, у мяне ж адзін выходны на тыдзень. Трэба ж хоць адпачыць”. На што ёй казалі: “Вось з такім падыходам у наступным годзе будзе ў цябе 365 дзён адпачынку”.*

Сход падсумаваў вынікі акцый пратэсту, якія ўжо адбыліся, і разгледзеў магчымыя варыянты тых, што маюць адбыцца ў студзені. Мяркуецца, што прадпрымальнікі выйдуць на Кастрычніцкую плошчу 12-га чысла. Жанчыны-прадпрымальніцы прапанавалі звярнуцца да Аляксандра Лукашэнкі як да гаранта канстытуцыйнага права на працу. Дарэчы, шмат свелтаўскіх жанчын ужо раз згубілі працу. На трактарным.

**Таццяна Таполя**

СВЯТЫ

# Перадсвяточныя неспадзяванкі

**За тыдзень да Калядаў на пошце не было ніводнай каляднай паштоўкі**



За тыдзень да Калядаў на 101-м паштовым аддзяленні ў Серабранцы было больш за 80 паштовак да надыходзячых святаў, аднак супрацоўніца пошты не здолела знайсці ніводнае, якой можна было б павіншаваць серабранаўцаў, што святкуюць Раство 25 снежня! На матчынай мове знайшлося ўсяго пяць паштовак з усіх святочных: для вернікаў Расейскай царквы чатыры і адна “навагодняя”. Калядных увогуле аніводнае.

Дзеля справядлівасці трэба дадаць, што загадчыца паштовага аддзялення Ірына Дзятко аператыўна адрэагавала на заўвагу нашага карэспандэнта. Праз тры дні яна запрасіла наведаць паштовае аддзяленне, каб пераканацца, што беларускамоўных паштовак ейнымі намаганнямі паболела ўдвая. Дырэктарка таксама паабяцала, што днямі прывязуць беларускамоўныя капэрты, якія яна адмыслова замовіла.

**Юрась Шпак-Рыжкаў**

# Прыйшла зіма, а з ёй – Мароз

**6 снежня, у касцёле Св. Яна Хрысціцеля, што ў Серабранцы, адбылася святочная літургія, прысвечаная Св. Мікалаю Мірылікійскаму.**

Яго ў народзе яшчэ завуць Мікола-Угоднік альбо Цудатворца. Каталікі пяці парафій ушанавалі тут памяць аднаго з найбольш папулярных сярод хрысціянаў і нават атэістаў святога (апошнім ён больш вядомы як Дзед Мароз савецкіх часоў). Абразы з выяваю Св. Міколы ёсць практычна ў кожнай царкве, касцёле ці зборы, ува многіх дамох і сем’ях, нават у аўтамабілях. Наш Дзядуля Мароз праславіўся не толькі каляднымі падарункамі дзеткам, але і незвычайнаю міласэрнасцю да людзей, імкненнем у любы спосаб дапамагчы ўсім, хто жыве ў нястачы і скрусе, выратаваннем тапельцаў і нявінна асуджаных, вылячэннем хворых і іншымі цудамі, выявы якіх можна пабачыць на некаторых ягоных абразох працы беларускіх майстроў.

**Міхал Жук**

# Дэпутат-фундатар

**Артур Лагодны**

Дэпутат ад Серабранкі падарыў музею старажытную вазу. Яна не ўпісвалася ў інтэр'ер яго кватэры.

Як паведамляе www.belmy.info, пра сваю вазу Дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Свіслацкай выбарчай акрузе № 94 Генадзь Давыдзька выпадкова ўзгадаў пры гутарцы з дырэктарам Музея гісторыі і культуры. Той адразу зацікавіўся. Аказалася, што вазе, па папярэдніх ацэнках, 800 гадоў.

### Не выкідаць жа...

Ваза аказалася каштоўнай, а дэпутату і артысту непатрэбнай. "Не ўпісвался ў інтэр'ер кватэры. Варта было адмыслова клікаць дызайнера. Ці выкідаць было трэба, ці ў нейкія запаснікі складаць. Дык лепш падарыць музею", – апраўдваецца за свой высакародны ўчынак сп. Генадзь.

### Падарунак лёсу

Генадзь Давыдзька распавёў для "ВС" гісторыю набыцця старажытнай вазы: "Падчас тэатральнага фестывалю ў Каіры, дзе я быў з Купалаўскім тэатрам, мы блукалі па спякотным горадзе, заходзілі ў розныя крамкі, якіх там багата. Шукалі розную экзатычную драбязу для родных і сяброў. І вось у адной лаўцы, дзе ўсё падалося больш танным і прывабным, я набыў шэраг розных статуэтак, сувенірчыкаў, манетак, якія выглядалі як старажытныя, але, мяркуючы па кошце, з'яўляліся



АРТУР ЛАГОДНЫ

падробкамі. Гаспадар мітусіўся, яшчэ нешта прапаноўваў. Я паказаў жэстам, што, калі ён аддасць мне ў дадатак яшчэ і тую бітую вазу (у цьмяным куточку стала некалькі слоікаў і вазончыкаў), тады куплю яшчэ нешта. Ён пагадзіўся".

### Мастацтва – народу

У дэпутацкай кватэры ваза заняла сваё пачэснае месца на піяніна. Яна стаяла б і надалей. Але неяк пры сустрэчы з дырэктарам музея Сяргеем Вечарам спадар Генадзь прагаварыўся пра яе існаванне. "Сяргей захацеў паглядзець яе. Ну, а калі паглядзеў: аддай, кажа. Я і аддаў. Нічога дзіўнага і гераічнага. Калі яна сапраўды мае каштоўнасць, дык няхай будзе ў музеі", – кажа Генадзь Давыдзька.

### "Засакрэчаны" экспанат

Мы звярнуліся у фондавы аддзел музея, праз які праходзяць усе паступленні. Там нічога канкрэтнага нам адказаць не змаглі, а параілі патэлефанаваць да намесніцы дырэктара па навуцы Ніны Калымага, якая нібыта займаецца той вазай, але і яна прызналася, што нічога пра вазу не ведае, бо ўсяго толькі… адміністратар. Урэшце мы патурбавалі дырэктара музея, які сябруе з Генадзем Давыдзькам.

### "Ваза ўнікальная ды ўсё"

"Так, я памятаю пра гэтую вазу. Яна зараз вывучаецца нашымі спецыялістамі. Па шчырасці, я зараз займаюся крыху іншай справай, і сходу мне цяжка пра яе нешта сказаць, бо яе лёс зараз не адсочваю. Ваза ўнікальная ды ўсё. Кошты вызначыць цяжка, а я люблю казаць дакладна. Штогод у музей трапляе больш за 2 тысячы экспанатаў. Крыніцы розныя: людзі дораць, закупае музей альбо атрымлівае паступленні з мытні", – паведаміў нашаму карэспандэнту дырэктар Сяргей Вечар.

### У чаканні спонсараў

Па словах дырэктара, музей вельмі зацікаўлены ў спонсарскай дапамозе, калі знаходзіцца нейкі каштоўны экспанат, а хтосьці з бізнесоўцаў яго выкупае, каб перадаць музею. "Пакуль выпадкі такой дапамогі, калі ўнікальны экспанат мы знаходзім, а банк ці фірма выкупляюць, у нас вельмі рэдкія. Вядомы выпадак, калі кампанія "British Tobacco" выкупала і дарыла Нацыянальнай бібліятэцы старадрукі,"– кажа Сяргей Вечар.

### Музей цэніць не толькі старажытнае

"Дэлегацыя з Ірану нам падарыла ісфаганскую вазу ручной работы. Рэч сучасная, але выкананая па старажытных тэхніках, якія налічваюць стагоддзі, і вельмі прыгожая. Мы яе адразу ўнеслі ў асноўны фонд музея", – дадае дырэктар Музею гісторыі і культуры.

# Давыдзька заступіўся за настаўнікаў

Дэпутат ПП ад Серабранкі Генадзь Давыдзька падняў пытанне аб прымусовай падпісцы школьных настаўнікаў на газеты, а таксама аб прымусовых паходах у музеі. Гэтыя пытанні ён адрасаваў міністру адукацыі Аляксандру Радзькову на сумесным паседжанні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі 28 лістапада.

Па словах Давыдзькі, яго выбаршчыкі скардзіліся, што настаўнікаў прымушаюць падпісвацца на афіцыйныя газеты. Таксама яны жаліліся, што па тры разы павінны вадзіць клас у адзін і той жа музей, каб не памяншаць паказчыкі па правядзенні культурных мерапрыемстваў.

Міністр адукацыі парыраваў, што настаўнік павінен чытаць газеты і працаваць з імі. Ён зазначыў, што цікавасць да газеты ў пісьменнага, цывілізаванага чалавека павінна быць, ды і ў музей, калі добра арганізаваць працу, можна і пяць разоў схадзіць.

**Паводле БелаПАН**

КАЛЯДНАЯ ЧЫТАНКА

**Пачнем з таго, што месца нашае, якое сёння мае назоў Серабранка, як і суседняя Лошыца, аб якой тут далей таксама будзе весціся, вядомае беларускім гісторыкам ажно з сярэдзіны XVI стагоддзя, а канкрэтна ад 1551 года. Толькі тады маёнтак у пойме Свіслачы называўся Срэбраны Лог (у XIX стагоддзі -- Срэбраны Млын). У XX стагоддзі тут існавалі Срэбраная вуліца і Срэбраны ж завулак. А калі браць пад увагу не толькі мемуарныя ці летапісныя нататкі, а і сучасныя даследаванні, то неабходна згадаць і той факт, што побач з Лошыцкай сядзібаю ў X стагоддзі існавала старажытнае паселішча, матэрыялы раскопаў якога сведчаць аб тым, што нашыя продкі пачалі асвойваць гэтыя мясціны прыблізна ў той жа час, калі забудоўваўся і сам Мінск.**

# Як лошыцкі Зміцер у Серабранцы
## селядца разам з цялушкаю з'еў




Ужо хутка будзе два вякі (1820 г.), калі ў Серабранцы нашай надарыўся быў анекдатычны, але абсалютна праўдзівы выпадак, пра які потым яшчэ некалькі дзесяціgоддзяў памятала ўся тагачасная Менская губерня.

Пра тое апавядае гісторык Алесь Белы, на якога мы раней ужо спасылаліся ў сваіх гістарычных эсэ:

"Лянівы й дурнаваты селянін Зьміцер з Лошыцы, маёнтку пана Прушынскага, прадаўшы ў Менску на рынку цялушку й атрымаўшы за яе пяцірублёвую асыгнацыю, гэтак званую сіненькую, купіў у дарогу за шэлег селядца і не знайшоў нічога лепшага, як паклаcьці яго ў тую самую кішэню, дзе ляжала сіненькая. Дарогаю дадому зь Менску ў Лошыцу Зьміцер завітаў у карчму ў Серабранцы ды й надумаў падсілкавацца селядцом. Ну й, вядома, абмыць удалы гешэфт зь цялушкаю".

А вось як разгортваліся далейшыя падзеі, апісаныя іхнім сучаснікам, класікам беларускай літаратуры Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам у знакамітай ягонае паэме "Вечарніцы":

*Зміцер за цялушку як сіню ўзяў.*
*Рад з торгу, у кішэню зараз улажыў.*
*Пасля селядца як за шэлег купіў.*
*Здуру, гдзе бумажка, туды ж яго ўклаў.*

*Сіня да мокрого селядца прыстала.*
*Дый між зубоў Змітра разам з ім папала,*

*А баш як квацеркай мазгі задурэў,*
*Не глядзя, з селядцом бумажку ён з'еў.*

*Скора звінуся!*
*Галоўка, хвасток ад селядца,*
*Баш, толькі асталіся;*

*Вочы працёр, рэштку, павярнуў рабром*
*Ад страху валасы дыбам падняліся!*

*Баш ля галоўкі бумажкі кусочак,*
*Прыліп, маўляў, дубовы лісточак.*

*Галавой аб сцяну б'ець,*
*Валасы на сабе рвець,*

*Рукі ломіць ды галосіць,*
*Рэштку сіненькай к карчмару падносіць:*

*"Мой жа ты бацечка!*
*Мой ты селязенька,*
*Да дай ж раду, што мне тут рабіць?*
*Хоць ідзі тапіся —*
*Нельга далей жыць!"*

Такім вось менавіта "смешным" чынам Лошыца й Серабранка яшчэ раз трапілі на старонкі гісторыі і літаратуры.




**Падрыхтаваў Міхал Жук**
**(малюнкі аўтара)**

КАЛЯДНАЯ ЧЫТАНКА

# Як два Святы ў адно сышліся

**У сярэднявечным Вялікім княстве Літоўскім – дзяржаве-папярэдніцы незалежнае Рэспублікі Беларусь, мірна суседнічалі розныя рэлігіі. Побач з касцёлам на галоўнае плошчы горада ці мястэчка ўзводзіліся і ўніяцкі збор грэка-каталікоў, і яўрэйская сінагога, і беларуская праваслаўная царква.**



Ікона Св. Міколы

Добра пачуваліся ў нашае верацерпнай краіне і Рэформатарская царква, і збеглыя ад пераследу расейскія стараверы, і мусульмане-нашчадкі некалі паланёных захопнікоў-татараў. Таму хрысціянскай нашу Беларусь можна лічыць толькі, як той казаў, з невялічкім націгам. Дый самае хрысціянства пачало павольна распаўсюджвацца ў нашае прадзяржаве ўсяго толькі тысячагоддзе назад, то бок значна пазней, як у нашых заходніх суседзяў, што давала падставы некаторым з іх прыходзіць да нас з г. зв. “крыжовымі паходамі”.

## Ад Ярылы да Юр’я

Да хросту нашыя продкі з’яўляліся “язычнікамі” ці паганцамі і вызнавалі шматбожжа. І хрысціянства, што нарэшце прыйшло на Літву-Беларусь, актыўна выкарыстоўвала ранейшыя язычніцкія ідэі, трансфармавала іхнія абрадавасці, святы, імёны.

У гітарычным эсэ “730 гадоў Пагоні” у сакавіцкім нумары “ВС” мы ўжо распавядалі нашым чытачам, як хрысціянізавалася імя нябёснага вершніка, абаронцы Беларусі. Запрасілі славяне (прабеларусаў гісторыкі яшчэ называюць заходнімі балтамі) да сябе варагаў, і славянскі назоў бога Сонца – Ярыла – трансфармаваўся ў скандынаўскае Юрга, адкуль да хрысціянскага Юрай заставаўся адзін крок. Цяпер Св. Юрай (Георгій)-Пераможца з Апостальскім крыжам на тарчы і мечам ва ўзнятае ўгору руцэ з нябёсаў бароніць нас ад ворагу, знішчае цмокаў, насланых нячыстым, стаіць за веру і праўду і самую нашую Айчызну. Для некага жа ён застаўся ранейшым Ярылам-Пагоняю.

Што да крыжа на тарчы, дык а ці ж мала розных магічных крыжоў-квадратаў ці ў выглядзе ромбаў з кропкамі ці без іх былі накрэсленыя на зямлі, высечаныя на камянёх ці вышытыя на вопратцы альбо абярогах нашых продкаў задоўга да нараджэння Збаўцы?

Прывяду яшчэ шэраг прыкладаў выкарыстання новай рэлігіяй беларускіх язычніцкіх абрадаў і святаў. Гэта, па-першае, Вялікдзень, які стаў Светлым Уваскрэсеннем Хрыстовым. Свята Перуна заняў Ілля-прарок, Купалу замяніў Ян-Хрысціцель, восеньскія Дзяды сталіся Днём Усіх Святых. Нарэшце дапялі мы й да Калядаў. Дарэчы, і Купала, і Каляда – гэта й ёсць насамрэч імёны паганскага бога Ярылы. Трэба адзначыць, што практычныя беларусы й сёння не выракліся сваіх старадаўніх традыцыяў.



**Дзень Св. Міколы ў серабранскай каталіцкай парафіі.**

Таму штогодна разам з Божым Нараджэннем мы святкуем і Каляды, водзім казу, Смерць, бусла і ваўкалака, а побач носім Бэтлеемскую зорку-прадвесніцу з’яўлення на гэты свет немаўляці Ісуса, расчынаем батлейку ды распавядаем біблейскія гісторыі.

## Аб елцы і Санта-Нікаласе

Зяленіва елкі, зразумела, неадрыўна звязанае з хрысціянствам, але традыцыя ставіць і ўпрыгожваць вечназялёнае дрэва на Раство ў беларусаў з’явілася толькі ў XIX стагоддзі. Тады ж, у эпоху Асветы, у Расіі і на каланізаваных ёю землях, у тым ліку й на Беларусі, узнікла і паняцце “Новы год”. Да таго часу 31 снежня беларусыліцьвіны святкавалі Дзень Св. Сільвестра. Дык і ўвогуле не было сэнсу праз тыдзень святкаваць тое ж нараджэнне Хрыста (ці тыя ж угодкі ягонага Раства, напрыклад, 1906 ад Н. Х.). Статус дзяржаўнага свята “Новы год” у беларусаў набыў толькі ў перыяд камуністычнага панавання, калі з хрысціянствам пачалася бязлітасная барацьба на знішчэнне.

*Вялікдзень, які стаў Светлым Уваскрэсеннем Хрыстовым. Свята Перуна заняў Ілля-прарок, Купалу замяніў Ян-Хрысціцель, восеньскія Дзяды сталіся Днём Усіх Святых.*

Але ж трэба згадаць, што прататыпам савецкага Дзядулі Мароза з’яўляецца ўсё ж такі хрысціянскі святы Мікола-Цудатворца. Ягоны дзень адзначаўся напачатку зімы, якраз на тры тыдні раней за Каляды. Дарэчы, былыя паганцы-беларусы надта ўжо ўпадабалі гэтага валачэбніка за цуды, таму цяпер шануюць ягоны абраз ледзь не нароўні з заўсёднаю тройкаю – Спасам, Маці Божаю ды Св. Юраем-Пагоняю.

Таму віншуем вас, дарагія суродзічы, па-першае, з Калядамі і Божым Нараджэннем! Ну й, канечне, атэістаў з надыходзячым 2009 годам ад Раства Хрыстовага і прыходам зімовага Св. Міколы – нашага беларускага Санта-Клаўса! :)

**6 снежня 2008 г.**

**Юрась Навіцкі**

**(фота аўтара)**

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# Беларускі шыбалет



12 снежня адбылася прэзентацыя кнігі Пётры Садоўскага “Мой шыбалет”. Аўтар – першы амбасадар незалежнай Беларусі ў Нямеччыне, дэпутат Вярхоўнага Савета XII склікання, мовазнаўца, які працяглы час жыў у мінскай Серабранцы.

Гісторыя “шыбалету” вядомая ажно з біблейскіх часоў. Гэта такі своеасаблівы моўны “парог”, які не здолелі адужаць тагачасныя ахрамейцы, пераможаныя больш моцным ворагам. Пераможцы не здолелі правільна вымавіць слова “шыбалет”, бо ў іх мове не было шыпячых. Па гэтай прыкмеце іх і вызначалі пераможцы, патрабуючы ад палонных паўтарыць слова ўголас. Мусіць, гэтая падзея сталася першым у гісторыі сусвету фактам праследу па моўнай прыкмеце. Зараз небяспечны стан беларускага слова непакоіць не толькі айчынных гуманітарыяў, бо мова ёсць падмуркам нацыі.




Нягледзячы на тое, што, па словах Пётры Садоўскага, галоўным героем мемуарнага твора з’яўляецца менавіта мова,



**Аўтар падпісвае кнігу жыхарам Серабранкі**

кожны чытач “Шыбалету” знойдзе там нешта сваё.

Кажучы словамі беларускіх паэтаў Леаніда Дранько-Майсюка і Анатоля Вярцінскага, у гэтых “аўтабіяграфічных арабесках” даступна і сумленна, без аніякага метафарычнага фальшу, разглядаецца праблема -- чаму беларус баіцца быць беларусам.

**Юрась Навіцкі**

МЕРКАВАННІ

# Пра “Шыбалет”

**Аляксандар Лукашук, рэдактар “Радыё Свабода”**

Гэта кніга чалавека, для якога шлях да сябе і Радзімы і ёсць свабода і шчасце.

**Пісьменнік і гісторык Уладзімер Арлоў**

Пётра Садоўскі ёсць прыкладам беларускага феномэну. Такіх людзей Рыгор Барадулін назваў прадстаўнікамі полацкага менталітэту, што ўпрыгожваюць усю Беларусь.

**Лявон Баршчэўскі, мовазнаўца, старшыня партыі БНФ**

Гэта самая цікавая для мяне кніга года. Чытаў яе ў цягніку на Варшаву, дык спахапіўся толькі а пятай ранку.

**Барыс Пятровіч, галоўны рэдактар недзяржаўнага часопіса “Дзеяслоў”**

Так пішацца сапраўдная гісторыя Беларусі, а не тая, што сёння ў падручніках.

У кнізе шмат імёнаў, шмат дзейных асобаў, Асобаў з вялікай літары.

**Паэт Анатоль Вярцінскі**

Кніга цікавая мне як беларусу. Пётра Садоўскі на старонках гэтай кнігі выступае вельмі яркім прадстаўніком мужчынскай паловы і Беларусі, і чалавецтва – гжэчны рыцар з пашанай да сваіх жанчын, да жанчын Беларусі.

**Вінцук Вячорка, мовазнаўца, намеснік старшыні ПБНФ**

Мы павінны дачакацца выхаду слоўніка сакавітае беларускае мовы Пётры Садоўскага.

**Паэт Уладзімер Някляеў**

Гэта кніга таленавітага чалавека, напісаная разумна. Разумна ў адносінах і да самога сябе, і да часу, і да спадарожнікаў па жыцці.

ВАРТА НАВЕДАЦЬ

# Далучымся да чароўнага

Калі Вы пройдзеце ад крамы “Палессе” праз Ракасоўскага, то ў доме № 49 сярод шэрагу розных крамаў, ламбарду, цырульні, сэканд-хэнду, пошты, цэнтру занятасці знойдзеце на першы погляд сціплыя вітрыны, на якіх напісана: “Гарадская мастацкая галерэя працаў Л. Шчамялёва”.

Трэба прызнаць, што я не адразу патрапіла на дзверы, якіх быццам і не было. Трошкі больш настойліва давялося пашукаць і ўваход. Ён знайшоўся… праз цырульню. І ў гэтым адчуваецца свой сімвалізм: каб знайсці дарогу да мастацтва, яе трэба добра пашукаць.

Уваход у галерэю платны, але кошт сімвалічны: столькі ж каштуе 1 талончык на праезд у гарадскім транспарце. Прыемна здзівіла, асабліва ў эпоху татальнай адмены льготаў, што для пенсіянераў, студэнтаў і школьнікаў зніжка 50%. Даўно ўжо не згадвала з пачуццём задавальнення пра сваё пенсійнае пасведчанне.

Адзін крок – і з мітусні і гарадскога шуму мы трапляем у царства прыгажосці, супакою, ціхай настальгіі. У адным з двух невялічкіх залаў мы можам пабачыць карціны народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва.

працяг на с. 7

ДЫСКУСІЯ

# Хто заплаціць двойчы?

Публікацыя паводле гутаркі са Станіславам Гусаком “АЭС можа быць, але... толькі французская”, якая з’явілася ў мінулым нумары “ВС”, выклікала жывую цікавасць чытачоў. Прапануем Вашай увазе водгук на матэрыял актывіста Антыядзернай кампаніі, эколага Юрася Меляшкевіча



АРТУР ЛАГОДНЫ

Упершыню за будаўніцтва АЭС у Беларусі выказаліся некаторыя фізікі-ядзершчыкі яшчэ ў сярэдзіне 90-х. У тыя часы не было палітычнай “замовы” на вырашэнне гэтага пытання. Ва ўладзе ішоў працэс абмеркавання мэтазгоднасці праекта. Для таго, каб вызначыцца з гэтай праблемай, Саўмін стварыў спецыяльную камісію, у якую былі запрошаны спецыялісты розных накірункаў і профіляў. Пасля скрупулёзнага даследавання гэтага пытання было вырашана накласці мараторый на будаўніцтва небяспечнага аб’екта тэрмінам на 10 гадоў.

Камісія агучыла канкрэтныя довады, з-за якіх будаўніцтва не можа быць распачата. Сярод іншага былі названыя праблемы, звязаныя з небяспекай эксплуатацыі рэактараў, нявызначанасцю далейшага лёсу ядзернай энергетыкі ўвогуле, праблемы з захаваннем адпрацаванага паліва. Таксама было пазначана, што рашэнне па пераглядзе мараторыя варта прымаць толькі пасля таго, як сучасная навука дасць адназначныя адказы на вызначанае кола пытанняў, а да таго часу, па рашэнні камісіі, кіраўніцтва Беларусі павінна прытрымлівацца мараторыя на рэалізацыю ядзернага праекта.

*Ужо больш за два гады ўрадам Беларусі абмяркоўваецца ідэя пабудовы ў рэспубліцы ядзернай электрастанцыі. Колькі гадоў спатрэбіцца для пошука крыніцы фінансавання небывалага праекта, ніхто адказаць не можа...*

Што змянілася з таго часу? Фактычна нічога. Мы так і не атрымалі адказу ні на адно цяжкое пытанне з тых, што стаяць перад ядзернай энергетыкай. Паломкі і няштатныя сітуацыі суправаджаюць функцыянаванне АЭС зараз, як і дзесяць гадоў таму, адпрацаванае паліва так і не знайшло свой “апошні прыстанак” ні ў могільніку, ні ў адпаведным рэпазітарыі, дэмантаж нават адной электрастанцыі застаецца фантастычна дарагім мерапрыемствам і па коштах часам пераўзыходзіць суму па пабудове новай АЭС. Відавочна, што разумныя довады дзяржаўнай камісіі натыкнуліся на палітычнае рашэнне, якое перамагло здаровы сэнс.

На месцы ядзернага плана энергетычнага развіцця Беларусі павінен быць распрацаваны план па ўвядзенні ў энергетычны баланс краіны альтэрнатыўных і ўзнаўляльных крыніц энергіі (ветракоў, малых ГЭС, установак па выпрацоўцы біягазу і г.д.).

Асобна павінна быць прапісана праграма па энергазберажэнні і рацыянальным выкарыстанні энергетычных рэсурсаў, прадугледжаны асобны план для экалагізацыі грамадскага мыслення, дзе ключавое месца павінна займаць менавіта беражлівае стаўленне да энергетычных рэсурсаў і ўмеранае іх спажыванне.

Менавіта такі падыход можа забяспечыць устойлівае развіццё Беларусі, вызваліць каштоўныя ва ўмовах нарастаючага эканамічнага крызісу матэрыяльныя рэсурсы і дазволіць пазбегнуць той небяспекі, якую нясе ў сабе “мірны атам”. У такім выпадку можна будзе з годнасцю заявіць, што галоўная мэта Антыядзернай кампаніі ў Беларусі дасягнута.

ВАРТА НАВЕДАЦЬ




АРТУР ЛАГОДНЫ

# Далучымся...

пачатак на с. 6

Гэта ўсяго толькі частка ягоных працаў – 70 палотнаў, якія ён падараваў напярэдадні свайго 80-годдзя нашаму гораду. Кожны адчуе тут для сябе самы блізкі і цёплы дотык сапраўднага вялікага мастацтва – і моладзь, і старэйшае пакаленне. У мяккіх фарбах нашай цудоўнай беларускай прыроды, у такіх пазнавальных партрэтах чараўніц-беларусачак, у жанравых малюнках нетаропкага беларускага быту – паўсюль мы можам адчуць станоўчую энергетыку, супакаяльную цеплыню.

Другі зал прысвечаны маладым сучасным мастакам і знаёміць нас з працамі новага пакалення. Тут нечакана для аматара мастацтва ўтапрапліваецца вялікі чорны раяль. Як аказалася, тут часам праходзяць музыкальныя вечарыны і прэзентацыі, на якія можна трапіць, калі ўважліва сачыць за аб’явамі ў той-сёй гарадской прэсе.

Так, да 4 студзеня ў гэтай зале працуе выстава мастакоў сцэны Ганны Балаш і Аляксея Гаявога пад назвай “Чароўныя сны”. Ганна Балаш – стыліст-пастаноўшчык, дэкаратар і дызайнер касцюму ў тэатры, кіно, канцэртных праграмах. Адна з найбольш вядомых яе прац у кіно – “Пастка для зубра” рэжысёра Віктара Шавялевіча. Аляксей Гаявы – мастак па касцюме Дзяржаўнага ансамблю “Харошкі”. Жывапісцы малююць на палатне ў вольны ад іншых творчых заняткаў час. Абаім аўтарам уласцівая рамантычнасць. Таму і назва выставы – “Чароўныя сны”. У гэтыя шэрыя снежаньскія дні візіт на выставу будзе вельмі дарэчы.

Галерэя Шчамялёва па праспекце Ракасоўскага, 49 працуе штодзённа з 11.00 да 19.00, акрамя нядзелі і панядзелка.

**Вера Зялёнка**

КРЫЖАВАНКА



**Уздоўж**: 1. Зялёны астравок у горадзе. 3. Іначай кажучы – карніз. 6. Клетка шахматнай дошкі. 8. Спецыяліст па ежы, кухар. 9. Помесь жарабка і асліцы. 11. Адна з галоўных уласцівасцей стравы. 12. Вуглякіслы натрый, без якога не абыходзіцца святочны пірог. 13. Маладая дзяўчына, асабліва шляхетнага паходжання. 17. Пышнасць у камфорце. 18. Горад у Літве, на Куршскай касе. 19. Вялікі, груваткі прадмет (размоўнае). 22. Ручная аптычная прылада. 24. Клуб у Серабранцы. 25. Канат з дроту. 27. Выгляд Месяца-маладзіка. 29. Служыцель культу ў яўрэйскай абшчыне. 30. Нараст на свечцы. 31. Міні-конь. 32. Дэкаратыўная садовая расліна з пахучымі кветкамі. 33. Музычны інструмент, падобны на скрыпку.

**Упоперак**: 1. Матэматычны знак. 2. Рух нагою пры хадзьбе. 4. Ранішняя зорка. 5. Савецкі военачальнік, імем якога названа вуліца на поўдні Серабранкі. 6. Прадмет, які служыць, каб гладзіць адзенне. 7. Калядна-навагодняе дрэва. 8. Сінонім ветразя. 10. Труба для адводу дыму з печы. 13. Дакумент на прахадной завода. 14. Апрацоўка каштоўнага каменя. 15. Тэст, праверка. 16. Шыйнае ўпрыгожанне з падвескамі. 20. Націск. 21. Склад зброі, амуніцыі. 22. Знаўца расліннага свету. 23. Адценне фарбы на карціне. 25. Самалётная ці карабельная лесвіца. 26. Павозка Дзеда Мароза і Снягуркі. 27. Драпежная начная птушка – сустракаецца ў Лошыцы. 28. Агароджа дома.

**Адказы:**

Уздоўж: 1. Парк. 3. Гзымс. 6. Поле. 8. Повар. 9. Лашак. 11. Смак. 12. Сода. 13. Паненка. 17. Раскоша. 18. Нерынга. 19. Бандура. 22. Бінокль. 24. «Касатка». 25. Трос. 27. Серп. 29. Рабін. 30. Нагар. 31. Поні. 32. Флёкс. 33. Альт.

Упоперак: 1. Плюс. 2. Крок. 4. Заранка. 5. Малінін. 6. Прас. 7. Елка. 8. Парус. 10. Комін. 13. Пропуск. 14. Агранка. 15. Проба. 16. Калье. 20. Напор. 21. Арсенал. 22. Батанік. 23. Колер. 25. Трап. 26. Сані. 27. Сава. 28. Плот.

**Склаў Вольф Рубінчык**

СМІ

# Цэнзар са швабрай

**Тацццяна Таполя**

**У рэдакцыю ад распаўсюднікаў газеты паступіла інфармацыя, што 13 снежня а 15 гадзіне вартаўніца дома № 4 па вуліцы Якубава не дазволіла перадаць жыхарам належныя ім экземпляры “ВС” № 7.**

Паводле заключэння нашага юрыдычнага аддзела, канс’ержка па сваёй святой простасці, забараніўшы распаўсюд у згаданым доме мясцовай газеты “Вольная Серабранка”, парушыла адразу два артыкулы (арт. 33, ч. 1, 3; арт. 34, ч. 1. 2) Асноўнага Закону Рэспублікі Беларусь.

Як вядома, азначаныя артыкулы Канстытуцыі гарантуюць грамадзянам Беларусі як “свабоду поглядаў, перакананняў і іхняе свабоднае выказванне”, так і “права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджанне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржорганаў, грамадскіх аб’яднанняў, аб палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя”. Далей у Законе гаворыцца аб тым, што ”цэнзура сродкаў масавай інфармацыі не дапускаецца” і што “дзяржаўныя органы, грамадскія аб’яднанні, службовыя асобы абавязаны забяспечыць грамадзяніну краіны магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі, якія закранаюць ягоныя правы і законныя інтарэсы”.

Па словах “звышпільнай” вартаўніцы, выконваць паліцэйскія функцыі яе змусілі ейныя кіраўнікі. Апошнія, відаць, спадзяюцца адказнасць за парушэнне Закону ўскласці на кволыя жаночыя плечы. Зважаючы на тое, што гэта пакуль адзінкавы падобны ўчынак з боку вартаўніцы і, хутчэй за ўсё, ненаўмысны, рэдакцыя вырашыла на першы раз не даваць ходу справе, а абмежавацца толькі гэтай публікацыяй.



МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

Мясцовае недзяржаўнае грамадска-палітычнае выданне “Вольная Серабранка”
Выдавец і заснавальнік – суполька дэмакратычных актывістаў Ленінскага раёна г. Мінска.
Друкуецца пры падтрымцы ЦВІ г. Мінска.
За змест матэрыялаў адказваюць аўтары.
Галоўны рэдактар – Артур Лагодны.
Пры выкарыстанні матэрыялаў і фотаздымкаў “ВС” спасылка абавязковая!
Газета выдаецца на беларускай мове сучасным правапісам
Капіяванне газеты і распаўсюд сярод сваякоў і знаёмых вітаецца.
Інтэрнэт-старонка: http://serabranka.at.tut.by
Рэдакцыйны інтэрнэт-адрас: serabranka@tut.by
Лісты можна дасылаць на адрас: *Мінск, пр. Машэрава, 8 (Управа ПБНФ), для рэдактара “ВС”*
Рэдакцыйны тэлефон: (8-029)9625143
**РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА БЯСПЛАТНА**
Наклад 299 экз. (дадаткова 1). Замова № 111.
Падпісана ў друк у 1:55 25.12.2008 г.